Вера Пракапцова

# Мастацкая адукацыя ў Нясвіжы другой паловы XVII–XVIII ст.ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Распаўсюджванне асветніцтва ў Беларусі другой паловы XVII–XVIII ст. Прыярытэт асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы. Развіццё мастацкай адукацыі і выхавання (г.зн. музычнай, тэатральнай адукацыі і навучання ў галіне выяўленчага мастацтва) у двух накірунках: культавым і свецкім.

Дыдактычны, функцыянальна накіраваны характар навучання ва ўстановах, якія фарміраваліся на аснове дзейнасці арганізацый розных канфесій: музычныя бурсы, заснаваныя каталіцкай царквой, брацкія школы, якія ствараліся праваслаўнымі ўстановамі, а таксама езуіцкія калегіумы.

Існаванне музычных бурсаў у шматлікіх гарадах Беларусі, утым ліку ў Нясвіжы XVII ст. Вызначэнне дзейнасці калегіума ў Нясвіжы працай у ім у 1625–1626 гг. выдатнага настаўніка рыторыкі, новалацінскага паэта, філосафа, тэолага, тэарэтыка літаратуры і красамоўства, таленавітага музыканта Мацея Сарбеўскага (1595–1640). Адзначэнне ў яго "Паэтыцы" адметнасці ўсіх сродкаў выразнасці спектакля, сінтэтычнага адзінства ігры акцёраў, музычнага і дэкарацыйнага афармлення, асвятлення спектакля. Выступленні педагогаў калегіума ў якасці мастакоў. Ян Тадэвуш Клаус – выкладчык спеваў і тэалогіі, таксама як і вынаходлівы мастак-дэкаратар. Існаванне школьнага тэатра (1696–1758) пры Нясвіжскім езуіцкім калегіуме як цэльнага асветніцка-выхаваўчага цэнтра, у якім сінтэтычна фарміраваліся драматычныя, музычныя, дэкарацыйна-мастацкія прынцыпы стварэння спектакля. Вучоба і практычная дзейнасць як шматгранны працэс адзінай з'явы.

Сігізмунд Лаўксмін (1596–1670) – філосаф, музычны і літаратурны

дзеяч, а таксама выкладчык паэтыкі ў Нясвіжы з 1631 па 1635 г. Увага да тэатральнай і музычнай адукацыі. С.Лаўксмін – аўтар першых айчынных падручнікаў па грэчаскай мове, музыцы і рыторыцы. Шматразовае перавыданне яго працы – падручніка "Практычнае красамоўства, або Правілы рытарычнага мастацтва" у Рэчы Паспалітай і гарадах Заходняй Еўропы.

Арганізацыя спецыяльных мастацкіх адукацыйных устаноў свецкага накірунку ў Нясвіжы XVIII ст. Дзейнасць Нясвіжскай капэлы – прыдворнага аркестра князёў Радзівілаў (1724–1809 гг.) і Нясвіжскага тэатра Радзівілаў (1740–1791 гг.) як падстава для функцыяніравання музычнай, тэатральнай і балетнай школ.

Стварэнне для падрыхтоўкі прыгонных "балетнікаў" і "балетніц" балетнай школы (1758–1790?). Кіраўнік школы – адзін з заснавальнікаў мужчынскага класічнага танца Л.М. Дзюпрэ (у 1758–1760 гг.), выкладчыкі – французскі "мэтр танцаў" Якуб Аліўе (з 1762 г.), прыгонны балетмайстар – Антон Лойка (з 1779 г.), Гаэтан Патынэці (з 1780 г.).

Існаванне спецыяльнай тэатральнай школы (1760–1780-я гг.) Выкладчыкі – С.Закшэўскі, М.Вернеруўна.

Дзейнасць спецыяльнай музычнай школы (1751–1809 гг.). Ігры на музычных інструментах і вакалу навучалі лепшыя музыканты капэлы: Дж.Канстанціні (скрыпка), І.Фляйшман (віяланчэль), Кенітцэр (флейта), Я.К.Фішэр (габой), Ф.Хофман (фагот) і г.д. Выкладчыкамі вакалу былі В.Нікаліні, Калаўш, Герман. Выкладчыцкай дзейнасцю таксама займаліся прыгонны скрыпач Ян Цэнціловіч (з 1751), дырыжоры Ф.Вітман (з 1756 г.), Д.Кернер (з 1770 г.), клавесіністы і кампазітары Я.Голанд (з 1780 г.), Я.Дусік (з 1786 г.), Дж.Альберціні (з 1781 г.).

Выхаванне прыдворных мастакоў. Ксаверый Дамінік Гескі-старшы (? –1764) і яго вучні – сын Юзаф Ксаверый, а таксама "казённыя мастакі" Скажыцкі, Лютніцкі, Заштаўнт, Андрэй і Канстанцін. Утрыманне пры Нясвіжскім двары ў 1785 г. 85 мастакоў-рамеснікаў, якія аднаўлялі і падтрымлівалі ўбранства палацавых будынкаў.

"Кажбушкі" – своеасаблівыя метадычныя дапаможнікі для малявання пры жывапісным аздабленні храмаў, выкананні ікон, падрыхтоўцы кардонаў для габеленаў, у разьбярстве. Наяўнасць вялікага набору інструментаў для разьбы, якіх у інвентары Нясвіжа 1779 г. налічвалася 32 назвы і 100 відаў.

Выхаванне ў Нясвіжскіх "тапісярнях" і "персіярнях" мясцовых ткачоў і ткачых, што абумовіла валоданне новымі тэхнікамі і выкарыстоўванне беларускіх матываў як асновы арнаменту.

Нясвіж у XVII–XVIII стст. – адзін з важнейшых цэнтраў мастацкай адукацыі на Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Wiera Prakapcowa

# EDUKACJA ARTYSTYCZNA W NIEŚWIEŻU DRUGIEJ POŁOWY XVII –XVIII w.

*W rozwoju edukacji artystycznej (muzycznej, teatralnej oraz w dziedzinie sztuk plastycznych) ukazane są dwa kierunki: religijny i świecki. Artykuł ukazuje funkcjonalnie ukierunkowany charakter działalności świeckich szkół artystycznych: baletowej (1758-1790?), teatralnej (1760-1780), muzycznej (1751-1809), które były stworzone na potrzeby kapeli nieświeskiej (1724-1809) i teatru Radziwiłłów (1740-1791). Przypomniane zostały imiona wykładowców, którzy w tych szkołach pracowali: L. M. Dupré, Jakub Olivier, Anton Łojka, Gaetano Patinetti (szkoła baletowa), S. Zakrzewski, M. Wernerówna (szkoła teatralna), J. Constantini, W. Nikolini, Jan Cenciłowicz, F. Witman, D. Korner, Jan Holland, J. Dusik, G. Albertini i in. (szkoła muzyczna).*

*Mowa jest też o kształceniu malarzy nadwornych, którym przewodził Ksawery Dominik Heski starszy. Nieśwież w XVII-XVIII w. ukazany jest jako jeden z najważniejszych ośrodków kształcenia artystycznego na Białorusi.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ